Васіль СТАРЫЧОНАК

# ТАЛЕНТ І ВЕДЫ – НОВАМУ ПАКАЛЕННЮ: ДА ЮБІЛЕЮ АЛЯКСЕЯ ГРУЦЫ

9 мая адзначае свой 90-гадовы юбілей вядомы беларускі мовавед, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР у галіне навукі, доктар філалагічных навук, прафесар Аляксей Пятровіч Груца.

Жыццёвая сцежка Аляксея пачалася ў в. Пішчыкі Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Яго дзіцячыя і юнацкія гады выпалі на складаны і суровы перадваенны і ваенны час. Пасля заканчэння ў 1941 г. 1-ай Дубровенскай сярэдняй школы працаваў па гаспадарцы, а ў лютым 1944 г. быў вывезены немцамі на прымусовыя работы ў Германію, адкуль быў вызвалены англійскімі войскамі ў красавіку 1945 г. З верасня 1945 да красавіка 1947 г. знаходзіўся на службе ў Савецкай Арміі, пасля завяршэння якой вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага. У час вучобы праявіў сябе як малады даследчык роднай мовы і (будучы студэнтам) удзельнічаў ў дыялекталагічных экспедыцыях па збіранні матэрыялаў для Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы.

Пасля заканчэння інстытута працаваў настаўнікам у г. Мінску. У 1957 г. перайшоў на працу ў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР, дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па гісторыі форм будучага часу ў беларускай мове. Працаваў спачатку ў якасці малодшага навуковага, пасля -- старшага навуковага супрацоўніка . Асноўная праца Аляксея Пятровіча канцэнтравалася ў групе па ўкладанні “Беларуска-рускага слоўніка” (1962) і аўтарытэтным калектыве па стварэнні “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы”. За гэту працу А.П.Груца ў ліку іншых сааўтараў у 1971 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. У 1969 г. А.П.Груца паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю “Развіццё складаназалежнага сказа ў беларускай мове”.

З верасня 1969 г. А.П.Груца працуе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М.Горкага, спачатку на пасадзе прафесара, пазней – загадчыка кафедры. Чытаў лекцыі па гістарычнай граматыцы, гісторыі рускай літаратурнай мовы, уводзінах у мовазнаўства, стараславянскай мове. З мэтай лепшага засваення складаных матэрыялаў па гісторыі мовы стварыў вучэбны дапаможнік “Стараславянская мова” (тэорыя і прмктыка).

Прафесарска-выкладчыцкую дзейнасць А.П.Груца паспяхова спалучае з навукова-даследчай работай. Ён з’яўляецца сааўтарам фундаментальнай працы “Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак” (1969), шматтомнага “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы”, пяцітомнага “Лексічнага атласа беларускай мовы° (1993-1997). У спісе навукова-метадычных прац Аляксея Пятровіча каля 150 пазіцый з агульным аб’ёмам звыш 200 друкаваных аркушаў. Сфера інтарэсаў навукоўца А.П.Груцы – сінтаксіс беларускай мовы, дыялектная лексіка, гісторыя мовы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лексікаграфія, параўнальна-гістарычныя даследаванні, розныя ззроўні моўнай сістэмы рускай і беларускай моў і і нш. Многія артыкулы надрукаваны ў аўтарытэтных замежных выданнях “Slawia orientalis” “ Slavia”, “Slavica Slovaca” і інш.

Аляксей Пятровіч амаль 40 гадоў жыцця прысвяціў выхаванню маладога пакалення, прывіванню будучым філолагам любові да роднай мовы, цікавасці да дыяхранічнага аспекту яе вывучэння. Шмат увагі прафесар надае падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Мнгія яго аспіранты і саіскальнікі абаранілі кандыдацкія дысертацыі. У розныя гады А.П.Груца з’яўляўся членам спецыялізачваных Саветаў БДУ, МДПІ, БДПУ па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, дзе неаднаразова выступаў у якасці эксперта і афіцыйнага апанента па многіх дысертацыях.

Сёння Аляксей Пятровіч плённа працуе над вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, новымі артыкуламі, імкнучыся перадаць свой вопыт і грунтоўныя навуковыя веды новаму пакаленню студэнтаў і навукоўцаў. А.П.Груца – чалавек сціплы, далікатны, адказны за сваю спрацу. Сваім аптымізмам ён запальвае тых, хто знаходзіцца побач: у неабходных момантах падбадзёрыць добрым словам, дасць слушную параду. Яго не пакідае пачуццё гумару, а афарыстычнае маўленне з выкарыстаннем трапных выразаў і вобразна-выяўленчых сродкаў да спадобы і студэнтам, і аспірантам, і выкладчыкам, якія ў прыемнай сяброўскай атмасферы могуць абмеркаваць надзённыя праблемы сённяшняй адукацыі і навукі.

Мы шчыра віншуем Аляксея Пятровіча з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту, доўгага шчаслівага жыцця. Няхай талент, веды і майстэрства прафесара яшчэ доўгі час служаць справе развіцця айчыннай навукі і адукацыі!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ